# АПОВЕСЦЬ «ПАЛЕСКАЕ ЛЕТА» МІКОЛЫ КАПЫЛОВІЧА: ДА ПЫТАННЯ СТЫЛЮ

***Н. В. Кузьміч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*kuzmich_nv@bsu.by*

У матэрыяле разглядаюцца некаторыя асаблівасці стылю беларускага пісьменніка Міколы Капыловіча. У якасці прыкладу ўзяты адзін з апошніх твораў аўтара – аповесць «Палескае лета».

***Ключавыя словы:*** беларуская литаратура; аповесць «Палескае лета»; індывідуальны стыль; Мікола Капыловіч.

# ПОВЕСТЬ «ПАЛЕСКАЕ ЛЕТА» НИКОЛАЯ КОПЫЛОВИЧА: К ВОПРОСУ СТИЛЯ

***Н. В. Кузьмич***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*kuzmich_nv@bsu.by*

В материале рассматриваются некоторые особенности стиля белорусского писателя Николая Копыловича. В качестве примера взято одно из последних произведений автора – повесть «Палескае лета».

***Ключевые слова:*** белорусская литература; повесть «Палескае лета»; индивидуальный стиль; Николай Копылович.

Пісьменнік Мікола Капыловіч ужо ў першым зборніку прозы «Скрозь жывуць людзі» выявіў свой адметны стыль, асаблівасцямі якога можна назваць лаканізм выяўленчых і лексічных прыёмаў і сродкаў, стрымана-лірычная танальнасць, моцны суб’ектыўны пачатак. У далейшым у зборніках «Дні ціхай восені» (1981), «Засада» (1979), «Чужы сваяк» (1987) гэтая стылёвая мадэль атрымала аналітычна-эстэтычнае паглыбленне і развіццё.

У творчай спадчыне М. Капыловіча асобае месца займае аповесць «Палескае лета» (1996). У аповесці моцная лірычная плынь; значная роля аўтара-апавядальніка, яго адчуванні і пачуцці звязваюць паміж сабой раздзелы твора. У аповесці тры дзеючыя асобы: аўтар выступае сюжэтна-кампазіцыйным цэнтрам, побач прысутнічаюць хлопчык Сяргейка, які прывёз пісьменніка да роднай Астражанкі, і палясоўшчык стары Нічыпар, хто пакінуў людзям у карыстанне леснічоўку, а сам з'ехаў да дзяцей у г. Мазыр. Стылявы малюнак не загрувашчаны моўна-выяўленчымі сродкамі; прастата адцяняе лагічную суладнасць раздзелаў, якія ў пэўнай меры могуць існаваць паасобку. Мастацкая задума (перадаць і данесці да чытача тое, што аўтару знаёма з дзяцінства, але заўсёды новае ў яго ўспрыманні) рэалізуецца ў танальнасці аповеду, у дэталях, апісаннях, у асаблівасцях пабудовы і сувязі частак (напрыклад, раздзелы на пачатку аповесці «Сяргейка», «Родная зямля», «Леснічоўка», «Успамін», «Мой родны лес»).

Мастацка-выяўленчая сімволіка ў тэксце знакавая, бо дае лірычнай плыні стылёва-эстэтычную моц і пачуццёва-эмацыйнае гучанне, адпаведна стварае настраёвасць. Напрыклад, у пачатку аповесці калі Сяргейка, якога выпадкова спаткаў аўтар на аўтастанцыі ў Лельчыцах, вядзе яго ў родны кут, на захмараным небе, пасівелым ад частых дажджоў, загараецца вясёлка. Гэта своеасаблівая брама, якая па волі пісьменніка ствараецца прыродай, і вядзе ў сапраўдны храм для аўтара – Палессе. Нават тая дэталь, калі хлопчык у сваёй яшчэ дзіцячай наіўнасці хоча дагнаць вясёлку, успрымаецца не як дураслівасць або ілюзія, а як рэальна апраўданае імкненне да прыгожага, што складае ўнутраную патрэбу.

Насычэнне эстэтычнага зместу аповесці адбываецца праз ацэнкі аўтарам з'яў і вобразаў роднага краю, дзе яму дарагое ўсё: травінка на сцежцы, што вядзе ў леснічоўку, гняздо, злепленае ластаўкай у калодзежы, трапятанне асінавага гнязда ад лёгкага ветрыку. Праз мастацкія малюнкі, дадзеныя ў сузіраннях, адчуваннях і ўяўленнях, аб'яднаных у раздзелы, пазнаецца Палессе, яго лясы, лугі, рэкі, дзе аўтар знаходзіць шмат прыгожага, а далучэнне да гэтага – эстэтычная задача, якая натуральна кладзецца ў кантэкст ідэйна-мастацкай задумы. Напрыклад, у аповедах пра дрэвы аўтар змяшчае цікавыя звесткі, экскурсы ў мінулае, што маюць пазнавальна-асветніцкі змест, – гэта яркія штрыхі да вобразу роднага Палесся. Арыентацыя на прыгожае, якое ў лясной палескай глыбінцы аўтар заўважае на кожным

кроку, адпаведным чынам уплывае на апісанне розных праяў, форму і танальнасць адступленняў, іх сувязь з іншымі мастацкімі фігурамі і дэталямі. Напрыклад, малюнак летняга дажджу на Палессі ў аўтара такі: «Ноччу ён падкрадваўся ціха, ахінаў лес, леснічоўку вільготным шапаценнем. Праз расчыненыя вокны патыхаў мокрым водарам жывіцы, колкай морассю. <…> …Ранішнія навальніцы сярдзітыя. Хлёсткія маланкі сцябалі па лесе з адцягам, і доўга пасля кожнай з іх хадзіў па лесе пошчак. Беленькая змейка спрытна падхоплівалася, падымала галоўку над дрэвамі, высвечвала, выхоплівала з паўзмроку верхавіны і, ляснуўшы сухім трэскам, зноў хавалася ў хмару» [1, с. 139].

Пісьменнік у творы, дзе ў аснове мастацкай задумы ляжыць асабістае, заўсёды аказваецца перад маральна-этычным выбарам. Тут ужо ёсць прамая залежнасць ад таго, якія каштоўнасці спавядае сам, а значыць, і сцвярджае іх, у тым ліку і стылявой структурай. Арыентацыя на прыгожае, якое ў лясной палескай глыбінцы аўтар заўважае на кожным кроку, адпаведным чынам уплывае на апісанне розных праяў, форму і танальнасць адступленняў, іх сувязь з іншымі мастацкімі фігурамі і дэталямі.

Праблема эстэтыкі стылю ў літаратуры ляжыць у светапогляднай сферы, у эмацыйна-псіхалагічным успрыманні і разуменні рэчаіснасці. Пісьменнік, хоча ён таго ці не, следам за логікай развіцця вобразаў і характараў (у нашым выпадку – за рухам сваіх думак і дзеянняў) арыентуецца на маральна-этычныя каштоўнасці, вызначальныя ў грамадстве. Гэтай задачы падпарадкоўваецца стылявая структура твора. Успрыманне літаратурнага твора, яго ўсебаковы аналіз і разуменне немагчыма без цэласнага падыходу, пры якім усе кампаненты выступаюць як адно цэлае, дзе стылю як устойлівай агульнасці вобразнай сістэмы, мастацкіх сродкаў і прыёмаў належыць істотная роля. Ён актыўна ўздзейнічае на пачуццёва-эмацыянальную сферу, на аснове якой фарміруецца эстэтычны ідэал, а гэта і з'яўляецца галоўнай мэтай літаратуры.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Капыловіч М.* Палескае лета. Лясная аповесць // Маладосць. 1996. № 11. С. 121–169.